Чэрвеньскія і маёвыя набажэнствы: “Магчыма, быў нейкі момант «ікс», калі гэта ўсё абарвалася”

Аўтар: Арцём Ткачук
27.06.2021 00:00



На нашых вачах сыходзіць у гісторыю традыцыя адпраўлення маёвых і чэрвеньскіх набажэнстваў ля прыдарожных крыжоў. Хутчэй за ўсё, падрастаючыя пакаленні будуць ведаць пра яе толькі з апавяданняў блізкіх. У чым прычыны і як ставіцца да гэтага працэсу? У размове з а. Юрыем Кулаем, кармэлітам, разбіраемся ў крыніцах заняпаду набажэнстваў у маі і чэрвені. Спрабуем намацаць гэтую рэчаіснасць, знайсці правільны падыход да яе. Разважаем і пра урбанізацыю, і пра стан веры, і пра сучасныя малітоўныя практыкі. †

– Айцец Юрый, у Вашай роднай мясцовасці былі традыцыі маёвых і чэрвеньскіх набажэнстваў? Якія ўспаміны засталіся?

– Па мамінай лініі ў нас уся сям’я католікі. Бабуля жыве ў Камянецкім раёне, там вельмі традыцыйная парафія. Людзі, натуральна, не маглі штодзённа прыходзіць у касцёл, таму збіраліся ля прыдарожных крыжоў і маліліся літаніямі. Ці чыталі, ці спявалі – хто як мог.

У маёй роднай парафіі ў Брэсце таксама былі гэтыя набажэнствы. Усё афіцыйна: пасля св. Імшы адбывалася выстаўленне Найсвяцейшага Сакраманту, спяваліся літаніі. Я як міністрант у гэтым актыўна ўдзельнічаў. Магу сказаць, што я асабіста прасякнуты гэтым. Для мяне натуральна, што май – гэта маёвыя набажэнствы, а чэрвень – чэрвеньскія.

Чэрвеньскія і маёвыя набажэнствы: “Магчыма, быў нейкі момант «ікс», калі гэта ўсё абарвалася”

Аўтар: Арцём Ткачук
27.06.2021 00:00



Чэрвеньскія і маёвыя набажэнствы: “Магчыма, быў нейкі момант «ікс», калі гэта ўсё абарвалася”

Аўтар: Арцём Ткачук
27.06.2021 00:00

